анекдоце на першы план выходзіць стэрэатыпнае ўяўленне пра беларусаў як памяркоўных і цярплівых людзей.

Так, анекдоты часцей за ўсё звязаны з характэрнымі асаблівасцямі менталітэту (ці стэрэатыпамі). Вышэй названыя рысы беларусаў, якія часцей актуалізуюцца ў анекдотах – працавітасць, памяркоўнасць, цярплівасць: *Вучоныя вырашылі правесці вопыт, як хто з нацый будзе паводзіць сябе ў экстрэмальнай сітуацыі. Паставілі ў цэнтры пустога пакоя стул з цвіком у цэнтры. Першым зайшоў рускі, сеў, стаў крчаць, лаяцца. Другім зайшоў украінец, прысеў, ускочыў, выкруціў цвік са стула і паклаў у кішэню. Трэцім зайшоў беларус, прысеў на цвік, войкнуў, але працягнуў сядзець, потым падумаў: "можа, так і трэба" і зноў сеў на цвік* У анекдотах пра беларусаў часцей падкрэсліваецца празмерная цярплівасць, пакорлівасць: *Цярпенне і труд, усё... ты беларус.*

**Заключэнне**.Такім чынам, гумарыстычныя жанры з'яўляюцца важнай крыніцай лінгвакраіназнаўчай інфармацыі, а самі яны могуць быць апісаны ў даведніках лінгвакраіназнаўчага тыпу. Нацыянальная спецыфіка гумару праяўляецца ва ўплыве на яго нацыянальных каштоўнасцей, уяўленняў, сацыякультурных стэрэатыпаў. Нацыянальная спецыфіка рэалізуецца ў наборы традыцыйных тэм і аб'ектаў гумару, тыповых прыёмах выкарыстання знакавых сродкаў стварэння камічнага эфекту і мадэлей іх разумення.

1. Анекдоты про белорусов. [Электронны рэсурс]. – Режым доступа: https://anekdoty.ru/pro-belorusov/. – Дата доступа:

## ФЛАРЫСТЫЧНЫ АКЦЭНТ У ПАЭТЫЧНЫМ СВЕЦЕ С. ЯСЕНІНА І Т. КЛЯШТОРНАГА

*В.Ф. Падстаўленка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Гонар любой літаратуры заўжды складаюць аўтары, мастацкія сістэмы якіх пераважна арыентаваны на нацыянальныя архетыпы. Пры гэтым адбываецца самабытная сітуацыя, калі прамаркіраваны нацыянальнымі архетыпамі творчы свет аўтара становіцца цікавым не толькі для лакальнай культурнай прасторы, але і для агульнасусветнай супольнасці рэцыпіентаў. Пераканальным доказам адзначанай думкі можа паслужыць творчасць С. Ясеніна і Т. Кляшторнага. Як вядома, паэтычны свет Сяргея Ясеніна з яго шчымлівым эмацыйным запалам, нацыянальнай асновай і яркай эксперыментальнасцю стаў арыенцірам для многіх сучаснікаў, у тым ліку і для Тодара Кляшторнага. Непаўторнае авангарднае мысленне гэтых аўтараў праяўлялася ў іх шматлікіх вершах, нават у межах дастаткова далёкіх ад філасофскіх сентэнцый тэм сучаснасці і асэнсавання сябе ў грамадстве.

Кранальныя патрыятычныя светы творцаў уключалі і, як калісьці пісаў Я. Колас, "вобразы мілыя роднага краю". І сярод базісных аб'ектаў у іх фларыстычных канцэптасферах варта назваць вобраз клёна. Ён пры ўсёй традыцыйнасці ў кожнага паэта набывае своеасаблівую семантыку, адметную экспрэсію і мастацкую функцыянальнасць. Такім чынам, праведзенае даследаванне відавочна актуальнае, бо дазваляе праз акрэсліванне новых тыпалагічных ліній экстэнсіфікаваць навуковую рэцэпцыю адносна вершаваных сістэм абодвух аўтараў.

**Мэта артыкула:** раскрыць семантыку мастацкага вобраза *клёна* ў паэзіі С. Ясеніна і Т. Кляшторнага, выявіць яго аўтарскую спецыфіку.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле з'яўляюцца вершы С. Ясеніна і Т. Кляшторнага з акрэсленым фларыстычным вобразам. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вобраз клёна ў паэзіі С. Ясеніна адлюстроўвае выразную тэндэнцыю паступовай сэнсавай экстэнсіфікацыі: так, спачатку ён падаецца як прыродаапісальная рэалія, якая хутка становіцца вобразам-сімвалам роднага краю. Ён звязаны з рэтраспектыўна-сугестыўнымі адчуваннямі лірычнага героя, яго ўспамінамі (напрыклад, у вершы "В те края, где я рос под клёном").

Вобраз згаданага дрэва вельмі важны для героя Ясеніна, таму ён у тэкстах заўжды характарызуецца шматаспектна: і з пункту гледжання яго ўзросту ("клеplanёночек маленький") ці натуральных стадый яго існавання ("подгнивший"), трансфармацый яго знешняга выгляду ў залежнасці ад каляндарнай пары ("голый", "опавший", "облезлый"). Вобраз клёна ў С. Ясеніна – гэта і вобраз метафарычна рэпрэзентаванай істоты з пэўнай жыццёвай гісторыяй, своеасаблівай біяграфіяй.

У асобных вершах Ясеніна вобраз адначанага дрэва выконвае функцыю мастацкага аўтарскага "альтэр эга". Прыкладам можа паслужыць верш "Мяцель", дзе фларыстычны канцэпт удала асацыятыўна раскрывае глыбіні паэтавага самаадчування ў скрушны час:

Облезлый клён
Своей верхушкой чёрной
Гнусавит хрипло
В небо о былом.
Какой он клён?
Он просто столб позорный –
На нём бы вешать
Иль отдать на слом.

И первого
Меня повесить нужно,
Скрестив мне руки за спиной,
За то, что песней
Хриплой и недужной
Мешал я спать
Стране родной. [1, с. 357
]

Трагічнасць асэнсавання часу і ўласнага няўдалага лёсу прыводзяць аўтара да распрацоўкі адкрытых асацыятыўна-сэнсавых паралелей паміж асабістымі расчараваннямі і апісаннямі жалобнага выгляду дрэва позняй восенню.

Такім чынам, вобраз клёна ў С.Ясеніна праходзіць шлях ад прамой намінатыўнай сутнасці да мастацкага сімвала ці ёмістага асацыятыўна-метафарычнага вобраза з аўтарэфлексійнай канатацыяй.

Ідэя непадзельнасці чалавека і прыроды актыўна распрацоўвалася і ў паэзіі Тодара Кляшторнага. Адносна вобраза клёна ў беларускага аўтара варта сказаць, што гэты фларыстычны канцэпт таксама часта метафарызуецца. Аднак тут няма сутнаснага "зліцця" ці атаясамлівання лірычнага героя з вобразам клёна. Пратаганіст Кляшторнага – гэта творца, равеснік, біяграфічна і светапоглядна блізкі аўтару. Ён любіць Беларусь, прачула называе яе маці ("Кляновыя завеі"). Лірычны герой марыць аб абсалютнай свабодзе, пастаянным пошуку, таму распачынае вялікае падарожжа па свеце. Хоць зараз ля яго акна "пасумуюць кляны" ("Пад шум ветру"), але герой упэўнены, што сучаснасць падорыць кожнаму шчасце, бо "ў нашых дзён залаты пераліў".

У вершы "Плачуць асеннія клёны" адзначаны ў назве вобраз каталізуе ідэю жыццёвых нягод, з якімі сутыкнуліся лірычны герой і яго каханая. Развіваючы тут тэму шчасця, аўтар сцвярджае прыярытэт высокіх пачуццяў над матэрыяльнымі каштоўнасцямі. Т. Кляшторны ў большасці выпадкаў выкарыстоўваў адкрытую асацыятыўнасць паміж лістападаўскімі карцінамі з апалымі кляновымі лістамі і развагамі над чалавечым (асабістым) існаваннем. Так, у вершы "Зацвілі сярэбраныя росы" адпаведныя пейзажныя замалёўкі перапыняюцца аптымістычным бачаннем жыцця, у якім "не шкада рассыпаных гадзін".

Клён у паэтычнай сістэме Т. Кляшторнага – вобраз, асабліва блізкі лірычнаму герою, гэта канстантны аб'ект свету Бацькаўшчыны, выразнік душэўных ваганняў пратаганіста.

**Заключэнне.** Вобраз клёна ў С. Ясеніна і ў Т. Кляшторнага выступае сімвалам роднага краю (у рускага паэта – гэта сімвал усёй вялікай радзімы – Русі, у беларускага – малой). Абодва аўтары анімічна рэпрэзентуюць прааналізаваны вобраз, часта метафарызуючы яго. Пры гэтым у прааналізаваных паэтаў вобраз клёна спрыяе псіхалагічна глыбокай перадачы ідэі "карэннай" з'яднанасці асобы і прыроды, неадасобленасці чалавека ад наваколля ў любы час і ў любых грамадскіх абставінах.

1. Есенин, С.А. Собрание сочинений: В 2-х т. Т. 2: Стихотворения. Проза. Статьи. Письма / Сост. и коммент. Ю. Л. Прокушева. — Минск: Мастацкая літаратура, 1995. — 382 с.

Рэпазіторый ВДУ